# ПСІХАЛОГІЯ

УДК 370.153

*М. Ф. Бакуновіч*

## АСАБЛІВАСЦІ МЭТ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ I КУРСА

Праблема вывучэння мэт вучэбнай дзейнасці і працэсу мэтаўтварэння пачынае прыцягваць увагу псіхолагаў [1]—[5].

Прадметам нашага даследавання з'яўляюцца асаблівасці мэт вучэбнай дзейнасці студэнтаў. У ім вырашаюцца задачы фармулявання студэнтамі мэт сваёй вучэбнай дзейнасці і выяўлення іх асаблівасцей паводле зместу. У адпаведнасці з задачамі выкарыстана праектыўная методыка незавершаных сказаў, пры дапамозе якой ажыццяўлялася вывучэнне мэт, а таксама прымянялася методыка А. Адлера [6] у якасці серыі трэніровачных практыкаванняў. Выкарыстанне такога дыягнастычнага інструментарыя дазволіла атрымаць разгорнутыя вербальныя апісанні мэт вучэбнай дзейнасці. Апрацоўка вынікаў праводзілася пры дапамозе кантэнт-аналізу шляхам вызначэння індэкса значнасці (частаты).

Аб'ектам даследавання з'явіліся студэнты I курса: рускай філалогіі (75 чалавек); факультэта беларускай філалогіі і культуры (75 чалавек) БДПУ імя Максіма Танка. Класіфікацыя вынікаў праводзілася на аснове вылучэння і сістэматызацыі мэт, якія ўключалі арыентацыю студэнтаў на будучую прафесійную дзейнасць. Гэта дазволіла згрупаваць матэрыялы эксперыменту спосабам, прадстаўленым у табліцы 1.

У артыкуле аналізуюцца мэты I і II парадку. Даследаванне мэт I парадку дазволіла выявіць ступень арыентацыі студэнтаў на будучую прафесійную дзейнасць. Вывучэнне мэт II парадку абумоўлівалася высокімі патрабаваннямі грамадства да асобы чалавека, які займаецца (ці будзе займацца) педагагічнай дзейнасцю.

Аналіз вынікаў паказаў, што з 767 адзначаных студэнтамі мэт вучэбнай дзейнасці 553 (72,09%) адносяцца да мэт I і II парадку.

***Табліца 1***

**Класіфікацыя мэт вучэбнай дзейнасці**

| *Катэгорыі* | *Характарыстыка катэгорый* | *Віды мэт дадзенай катэгорыі* |
|---|---|---|
| Мэты I парадку | Непасрэдна арыентаваныя на будучую прафесійную дзейнасць | • прафесійна арыентаваныя мэты |

| *Катэго-рыі* | *Характарыстыка катэгорый* | *Віды мэт дадзенай катэгорыі* |
|---|---|---|
| Мэты II парадку | Апасродкавана звязаныя з будучай прафесійнай дзейнасцю | • мэты самаўдасканалення<br>• альтруістычныя мэты<br>• камунікатыўныя мэты |
| Мэты III парадку | Пазапрафесійныя | • матэрыяльныя мэты<br>• сацыяльныя мэты<br>• мэты дасягнення<br>• эгацэнтрычныя мэты |

Працэнтныя паказчыкі сведчаць аб яўнай перавазе мэт, якія непасрэдна арыентаваны і апасродкавана звязаны з будучай прафесійнай дзейнасцю, над пазапрафесійнымі. Індэксы значнасці мэт вучэбнай дзейнасці прадстаўлены ў табліцы 2.

***Табліца 2***

**Характарыстыкі значнасці мэт па зместу**

| *Катэгорыі* | *Віды мэт* | *Індэкс значнасці* |
|---|---|---|
| Мэты I парадку | • прафесійна арыентаваныя мэты | 0,198 |
| Мэты II парадку | • мэты самаўдасканалення<br>• альтруістычныя мэты<br>• камунікатыўныя мэты | 0,587<br>0,117<br>0,095 |

Як відаць з табліцы, найбольшую значнасць маюць мэты самаўдасканалення, што абумоўлена дамінуючай у студэнцкім узросце патрэбай фарміравання ўзорнай асобы дарослага чалавека. У якасці кірункаў самаразвіцця імі вызначана: павелічэнне аб'ёму інфармацыі ("атрымаць вышэйшую адукацыю"), удасканаленне (або развіццё) сваіх здольнасцей ("пазнаць сябе і свае здольнасці"), фарміраванне асобасных рыс ("развіць упэўненасць у сабе"), набыццё жыццёвага вопыту ("умець лепш разбірацца ў людзях"). Неабходна адзначыць мэты вучэбнай дзейнасці, якія характарызуюць студэнтаў-філолагаў ("стаць адукаваным чалавекам", "удасканаліць сваю мову").

Другое месца займаюць прафесійна арыентаваныя мэты, што дэманструе складанасць працэсу адаптацыі да вучэбнай дзейнасці ва універсітэце. Іменна змест гэтых мэт вызначаецца нядаўняй неабходнасцю выбару прафесіі і жыццёвага шляху ("атрымаць прафесію", "стаць настаўнікам") і станам цяперашняй вучэбнай дзейнасці ("атрымаць цікавасць да прафесіі").

Завяршаюць рангавы спіс альтруістычныя і камунікатыўныя мэты. Выбар альтруістычных мэт у якасці мэт вучэбнай дзейнасці ("мае веды спатрэбіліся іншым")

свєдчыць аб характэрным для маладых людзей гэтай узроставай і сацыяльнай групы жаданні ўплываць на ўдасканаленне свету і грамадства, а таксама аб усталяваным у грамадстве разуменні ролі настаўніка. Асаблівасці зместу камунікатыўных мэт паказваюць накіраванасць студэнтаў на пазітыўны кантакт з рознымі (блізкімі) людзьмі (“мною ганарыліся родныя”), на павелічэнне кола зносін (“мець кантакты з цікавымі людзьмі”), на пазбаўленне ад розных комплексаў (“заслужыць павагу іншых”). Адзначым, што толькі адзін студэнт вызначыў у якасці мэты вучэбнай дзейнасці “мець магчымасць больш часу праводзіць з дзецьмі”.

Акрамя таго, у ходзе даследавання прадугледжвалася і выяўленне асаблівасцей фармулявання мэт вучэбнай дзейнасці. Фармулёўкі мэт характарызуюцца рознай ступенню выразнасці прадугледжаных вынікаў дзейнасці: канкрэтнасць—агульнасць або абстрактнасць, адназначнасць—неадназначнасць, дакладнасць—недакладнасць або неакрэсленасць. Аналіз матэрыялу паказаў наяўнасць канкрэтна сфармуляваных мэт — 381, якія ўяўляюць сабой дакладныя выразы спосабаў дзеяння, і 172 увогуле акрэсленых, што дазваляюць вызначаць толькі агульны накірунак дзейнасці. Варта адзначыць прысутнасць у групе канкрэтных мэт 138 так званых канкрэтна-аперацыянальных, у якіх адлюстроўваецца актыўная пазіцыя суб’екта дзейнасці на шляху дасягнення вынікаў.

Параўнальны аналіз частаты канкрэтных і агульных фармулёвак мэт I і II катэгорый прыведзены ў табліцы 3.

*Табліца 3*

**Характарыстыкі значнасці мэт у залежнасці ад асаблівасцей фармулявання**

| *Катэгорыя* | *Віды мэт* | *Індэкс значнасці* | |
|---|---|---|---|
| | | *канкрэтныя* | *агульныя* |
| Мэты I катэгорыі | • прафесійна арыентаваныя мэты | 0,427 | 0,572 |
| Мэты II катэгорыі | • мэты самаўдасканалення | 0,781 | 0,219 |
| | • альтруістычныя мэты | 0,369 | 0,631 |
| | • камунікатыўныя мэты | 0,754 | 0,245 |

Яўная перавага канкрэтных фармулёвак над агульнымі назіраецца сярод мэт самаўдасканалення і камунікатыўных, што можна вытлумачыць наяўнасцю ў студэнтаў уменняў рэальна ацэньваць свае здольнасці і якасці на аснове светапогляду, які склаўся ў старэйшым школьным узросце. Таму студэнты першага курса дакладна вызначаюць тыя рысы або якасці асобы, якія трэба, на іх думку, развіць або ўдасканаліць (канкрэтна-аперацыянальныя мэты): “навучыцца аналізаваць вершы”, “удасканаліць сваю мову”. Разам з тым імі

сфармуляваны неакрэсленыя мэты, у якіх адлюстроўваецца пасіўнасць маладога чалавека як суб'екта дзейнасці. Напрыклад, фармулёўка "атрымаць веды" характарызуе наяўнасць школьнага стылю адносін да вучэбнай дзейнасці.

Уменне сфармуляваць канкрэтныя камунікатыўныя мэты дэманструе адэкватнае разуменне студэнтамі ўзаемадзеяння у сістэме «чалавек—чалавек» («апраўдаць надзеі бацькоў», «мець магчымасць кантактаваць з цікавымі людзьмі»). Варта адзначыць наяўнасць адназначных фармулёвак мэт, якія ўключаюць аперацыянальны кампанент («навучыцца падтрымліваць гутарку ў любой кампаніі»).

У якасці канкрэтных фармулёвак прафесійна арыентаваных мэт студэнты вызначаюць і канкрэтна-аперацыянальныя ("навучыцца разумець сапраўдную літаратуру") і мэты, у якіх выяўляюцца пасіўныя адносіны студэнтаў да працэсу пазнання ("атрымаць прафесію", "атрымаць інтарэс да прафесіі"). Да агульных вызначэнняў мэт студэнты адносяць «стаць спецыялістам», «стаць добрым настаўнікам».

Такія суадносіны канкрэтных і агульных фармулёвак выклікаюць пэўную цікавасць. Рэзультаты сведчаць, паправершае, аб адсутнасці ў фармулёўках спосабаў дзеяння па дасягненню рэальных вынікаў. У студэнтаў пакуль не сфарміравана сістэма канкрэтных уяўленняў аб асаблівасцях будучай прафесійнай дзейнасці, якасцях настаўніка-прафесіянала. Напрыклад, «стаць добрым настаўнікам» — добрая мэта, але што ўкладвае студэнт у паняцце «добры настаўнік» незразумела, і якім чынам ён стане прафесіяналам, таксама высвеціць складана. Па-другое, прысутнасць шырокіх фармулёвак мэт сведчыць аб несфарміраванасці адпаведных матываў як апрадмечаных патрэб (А. Н. Лявонцьеў). Па-трэцяе, атрыманыя даныя дэманструюць слабае асэнсаванне студэнтамі школьнага вопыту. Студэнт у большасці выпадкаў не ўмее ацэньваць сваіх уменняў і навыкаў, не можа вызначыць з іх неабходныя, непасрэдна звязаныя з поспехамі ў будучай прафесійнай дзейнасці.

Апошняе месца па частаце канкрэтных фармулёвак належыць альтруістычным мэтам. У якасці прыкладаў канкрэтных мэт можна прывесці «вучыць і выхоўваць іншых». Агульныя фармулёўкі «аб дапамозе іншым, краіне», жаданне «зрабіць у будучым каму-небудзь лепей» з'яўляюцца, па сутнасці, сацыяльна адобранымі стэрэатыпнымі выказваннямі, цудоўнымі па гучанню і утапічнымі па сутнасці, бо яны цалкам пазбаўлены сродкаў і спосабаў іх рэалізацыі.

Зробім вывады.

1. У вучэбнай дзейнасці студэнтаў I курса па зместу вылучаюцца мэты, непасрэдна арыентаваныя на будучую прафесійную дзейнасць, апасродкавана з ёй звязаныя, і пазапрафесійныя.

2. Паводле даных эксперыменту, мэты самаўдасканаа-

лення маюць большы індэкс значнасці, чым прафесійна арыентаваныя мэты.

3. Паводле даных эксперыменту, у фармулёўках мэт вучэбнай дзейнасці дамінуюць канкрэтныя выказванні мэт самаўдасканалення. Прафесійна арыентаваныя мэты выражаны ў большасці выпадкаў агульна, неакрэслена і неадназначна.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. *Бибрих Р. Р.* Исследование видов целеобразования. Кишинев, 1987. С. 130.
2. *Бибрих Р. Р., Васильев И. А.* Особенности мотивации и целеобразования в учебной деятельности студентов младших курсов // Вестник Московского университета. 1987. № 2. С. 20—30.
3. *Иващенко Ф. И.* Особенности целеполагания в деятельности воспитателя // Психология. 1997. № 9. С. 3—10.
4. *Мартынюк И. О.* Жизненные цели личности: понятие, структура, механизмы формирования. Киев, 1990. С. 124.
5. Психологические механизмы целеобразования / Отв. ред. О. К. Тихомиров. М., 1977.
6. *Фейдимен Дж., Фрейгер Р.* Личность и личностный рост. М., 1992. С. 32.



## *SUMMARY*

*The article analyses the peculiarities of contents and formulating of students' educational activity purposes. The classification of results has been carried out on the basis of choice and systematization of purposes with student orientation to future professional activity, and in dependence on availability of concrete or abstract wording.*


УДК 152.26:371.93

*Я. Р. Анапрэенка*

# КАРЭЛЯЦЫЯ АКЦЭНТУАЦЫЙ ХАРАКТАРУ І ТАТУІРОВАК У ПАДЛЕТКАЎ, СХІЛЬНЫХ ДА СУПРАЦЬПРАЎНЫХ ПАВОДЗІН

Для выпрабаванняў трываласці, вынослівасці, пасвячэння ў клас мужчын, а таксама для вызначэння прыналежнасці да роду ў многіх народаў Азіі, Амерыкі, Акіяніі з даўніх пор існавалі рытуалы нанясення на цела малюнкаў. Гэты перажытак захаваўся да нашых дзён у многіх народаў. Зараз назіраецца спецыфіка татуіровак у людзей рознага сацыяльнага статусу, накіраванасці. Даволі часта з'яўленне татуіровак звязана з крымінальным асяроддзем, чым з поспехам карыс-